зом, в русской устной публичной речи жителей г. Витебска также существует указанная тенденция.

Список литературы

1. Голуб, И. Б. Книга о хорошей речи / И. Б. Голуб, Д. Э. Розенталь. – М. : Культура и спорт: Изд. об-ние «ЮНИТИ», 1997. – 267 с.
2. Ширяев, Е. Н. Культура речи как особая теоретическая дисциплина / Е. Н. Ширяев // Культура речи и эффективность общения / Отв. ред. Л. К. Граудина, Е. Н. Ширяев. – М., 1996. – С. 7 – 40.
3. Лаптева, О. А. Живая русская речь с телеэкрана: Разговорный пласт телевизионной речи в нормативном аспекте / О. А. Лаптева. – М. : Издательство ЛКИ, 2007. – 520 с.
4. Шмелев, А. Д. Ложная тревога и подлинная беда [Электронный ресурс] / Отечественные записки. – №2 (23). – М., 2005. – Режим доступа: http://www.philology.ru/linguistics2.htm. – Дата доступа: 16.05.2013.
5. Шапошников, В. Н. Комиссия «Русский язык в средствах массовой информации» Совета по русскому языку при Правительстве РФ. Русский язык в эфире: проблемы и пути их решения [Электронный ресурс] / Научно-информационное агентство «Наследие отечества». – Режим доступа: http://old.nasledie.ru/obraz/7_2/7_2_2/article.php?art=35. – Дата доступа: 16.01.2013.

## ІДЭЙНА-ТЭМАТЫЧНАЯ І ВОБРАЗНАЯ ПЕРАЕМНАСЦЬ У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ КАЗЦЫ

*В.Ф. Падстаўленка*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Вобразная сістэма кожнай нацыянальнай літаратуры ўтрымлівае і вобразы-канцэпты, тыповыя мастацкія мадэлі, з філасофскім базісам, метафарычнай іншасказальнасцю, алегарычнасцю. Іх вывучэнню традыцыйна прысвечана шмат даследаванняў на мяжы літаратуразнаўства, культуралогіі, філасофіі і псіхалогіі, што абсалютна заканамерна, бо глыбокая тэарэтычная інтэрпрэтацыя мастацкіх вобразаў такога кшталту магчыма толькі праз карэляцыю з міждысцыплінарным навуковым кантэкстам.

У сусветным мастацтве вобраз воблака з’яўляецца сэнсава варыянтным, полісемантычным. Так, у хрысціянскай традыцыі ён сімвалізуе боскую прысутнасць сярод абранага народа і прароцкасць. Названы вобраз успрымаецца як пасрэднік паміж нябесным светам і зямным, рэальным і магчымым, быццём і марай. Такая шырокая філасофская канцэптуальнасць вобраза звязана з тым, што ў мастацтве (перадусім нас цікавіла літаратура) творчым мадэлям воблака надаваліся сэнсаваёмістыя канатацыі. Яго зменлівасць, “туманнасць” выявы, перманентная здольнасць да формавай трансфармацыі былі раскрыты ў многіх іншасказальных карцінах і філасофскіх роздумах. За дадзеным вобразам замацаваўся імідж шукальніка, вандроўніка, які імкнецца да высокай мэты, прагне светапоглядных адкрыццяў і інтраспектыўнага пазнання.

Воблака – гэта крыніца крэатыўнасці, актыўнага стваральнага пачатку, яно ніколі не бывае нерухомым, як само жыццё ці чалавечы шлях у свеце. Воблака – светлае, лёгкае, недасяжна высокае, нібы абсалютная маральнасць ці духоўны ідэал асобы, таму ў мастацтве растыражавана супастаўленне названага вобраза з чалавечай душой. Канцэптуальнасць воблака з’яўляецца ўніверсальнай і для “дарослай” літаратуры, і для “дзіцячых” твораў, але з пэўнымі (часам даволі істотнымі) мастацкімі нюансамі.

Мэта артыкула: раскрыць ідэйную сутнасць і мастацкую спецыфіку вобраза воблака ў беларускай літаратурнай казцы, выявіць праблемна-тэматычную скіраванасць адпаведных твораў, іх дыскурсную самабытнасць.

**Матэрыял і метады.** Аб’ектамі даследавання ў артыкуле з’яўляюцца казкі “Хмарка” Я. Коласа, “Пухнацік” А. Дударава, “Воблачка” А. Масла.

Асноўнымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, структурна-тыпалагічнага і дэскрыптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Шматгадовае даследаванне Якубам Коласам нацыянальнага свету беларусаў прывяло класіка ў “Казках жыцця” да “завуаляваных” сімваліка-алегарычных мастацкіх прыёмаў, пры дапамозе якіх аналізаваліся прыродныя вобразы. Адной з дамінант сярод іх становіцца прыгожая белая хмарка (як аўтарскі варыянт вобраза воблака). Важкасць гэтага аб’екта даказваецца тым, што яму прысвечана не толькі казка “Хмарка” ў адзначаным зборніку, але і некалькі ранніх вершаў, напісаных прыблізна ў адзін час са згаданым празаічным прыкладам.

Агульная мастацкая канцэпцыя вобраза ўдала акрэслена Коласам у вершы “Хмаркі” (1913):

Рэпазіторый ВДУ

“Светлыя хмаркі – дзеткі прастору –
Ціха па небе плывуць.
Ім не знаёмы слёзы і гора,
Смутак і жаль іх не рвуць” [1, 126].

Гэтыя вольныя стварэнні паказаны надзвычайна шчаслівымі, бестурботнымі, пазбаўленымі сацыяльных сувязей, але, як сцвярджаецца ў творах, – гэта антышчасце.

Пазнанне рэчаіснасці гераіняй коласавай казкі мела драматычны характар, бо першапачатковая анталагічная рэцэпцыя Хмаркі была неаб’ектыўнай, штучнай: “З тэй страшэннай высачыні <…> усё выглядала вельмі хараша, вельмі прыгожа: здалёку ўсё ўяўляецца нам іначай, як яно ёсць папраўдзе” [2, 291]. З твора відавочна вынікае, што існае шчасце магчыма толькі на бацькаўшчыне і ў шчырым слугаванні пакрыўджаным. Гэтая тэза часткова дэтэрмінавана тагачаснай грамадска-палітычнай сітуацыяй і выяўляе аўтарскую патрыятычную пазіцыю.

Аднак і ў пазнейшыя гады вобраз хмаркі (воблачка) і адзначаныя ідэі класіка канстантна захоўваюць актуальнасць, па-мастацку экстэнсіфікуюцца, што адлюстравана, напрыклад, у казцы А. Дударава “Пухнацік”.

Часава апрабаваныя крытэрыі народнай філасофіі існавання дазволілі абодвум пісьменнікам удала пазбягаць акадэмічнага дыдактызму і малаэфектыўнай апісальнасці. Жадаючы вычарпальна раскрыць характары сучаснікаў і іх сацыяльныя прыярытэты, пісьменнікі апелявалі да адпаведных асацыятыўных сітуацый, так бы мовіць, з Вялікага Свету, свету прыроды, які можа стаць мудрым дарадцам і настаўнікам для чытачоў.

Пры гэтым заўважаюцца некаторыя асаблівасці. Алегарычная сістэма Коласа не ўключае рэалістычны вобраз чалавека, аднак апасродкавана раскрывае яго маральную, сацыяльную і грамадзянскую сутнасць. У Дударава мастацкія вобразы людзей прысутнічаюць у казачнай прасторы, яны актыўна ўключаюцца ў цэнтральныя перыпетыі, ініцыіруюць многія сюжэтаўтваральныя падзеі.

У казцы “Пухнацік” аўтар разважае над такімі філасофскімі ідэямі, як асэнсаванне свайго прызначэння ў свеце і шляхі пазбаўлення ад пакутлівай адзіноты. Як вынікае са зместу твора, чалавечае жыццё – імклівы палёт, палёт не бязмэтны, а накіраваны на пошук уласнага месца, на стварэнне сваёй сям’і, на памнажэнне дабра ў свеце. Толькі такое існаванне – годнае.

Ідэйна-тэматычная і вобразная магістральнасць, зададзеная Коласам у прааналізаваным творы, прадстаўлена і ў казцы “Воблачка” Алены Масла. На прыкладзе драматычнай гісторыі галоўнай гераіні тут даследуецца праблема спозненага разумення сапраўднага сэнсу існавання, у якім выключныя месцы займаюць Радзіма і родныя людзі.

У адпаведнасці са згаданай вышэй мастацкай канцэптуальнасцю вобраз пратаганіста рэпрэзентуецца як алегарычнае ўвасабленне дзіця, маленькага чалавека ў актыўнай стадыі свайго маральна-псіхалагічнага развіцця і выпрацоўкі аксіялагічных арыенціраў. Мастацкі канфлікт у казцы персанажна не пазіцыянаваны, а мае больш інтраспектыўную скіраванасць, бо ўзнікае як дыялектычны вынік паміж марамі Воблачка і яго магчымасцямі, жаданай поўнай свабодай і правіламі выхавання, жыццёвымі абставінамі. Падлеткавы максімалізм, адсутнасць практычнага досведу абумовілі аберацыйныя погляды і рашэнні Воблачка. Для гераіні характэрна ілюзорная рэцэпцыя існавання як неабмежаванай прасторы, светлай і радаснай, без перашкод і выпрабаванняў. Аднак аўтарам сцвярджаецца, што свет базуецца на амбівалентных імператывах.

Ужо пасля першага выпрабавання (выпадковага ўдзелу у шалёнай бітве Ветру і маланак) Воблачка адчувае сваю бездапаможнасць і шукае паратунку ў матчынай хаце. Праз казачныя перыпетыі ўдала раскрываецца своеасаблівы анталагічны парадокс: бяздонная вышыня і прастор, якія клічуць да самапазнання і перманентных адкрыццяў, каштоўныя толькі тады, калі ў асобы ёсць адмысловыя “кропкі апоры” (канцэпты светапогляднага прымання ці адштурхоўвання): радзіма, дом, сям’я. Без іх няма і самой асобы.

**Заключэнне.** Такім чынам, вобраз воблачка (хмаркі) мае пазачасавую актуальнасць і чалавеказнаўчую канстантнасць мастацкай інтэрпрэтацыі. З улікам гэтага казкі прааналізаваных пісьменнікаў моцна ўплываюць на свядомасць рэцыпіентаў, іх маральна-этычныя і светапоглядныя арыенціры.

Спіс літаратуры

1. Колас, Я. Збор твораў : у 7 т. Т. 1 : Вершы ; Апавяданні вершам (1904-1917) / Я. Колас. –Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1952. – 551 с.
2. Колас, Я. Новая зямля. Казкі жыцця: паэма, апавяданні / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 374 с.

Рэпазіторый ВДУ